## § 5. Гукі беларускай мовы, іх вымаўленне і абазначэнне на пісьме

**25.** Устанавіце адпаведнасць паміж асноўнымі фанетычнымі законамі беларускай мовы і іх характарыстыкамі.

| | |
|---|---|
| 1) аканне | а) пераход ***е, ё*** ў ***я*** |
| 2) яканне | б) пераход [д] у [дз’] |
| 3) дзеканне | в) пераход [т] у [ц’] |
| 4) цеканне | г) пераход ***о, э*** ў ***а*** |

Прывядзіце прыклады, якія ілюструюць адпаведныя фанетычныя законы.

**26.** Прачытайце тэкст. Растлумачце напісанне выдзеленых літар.

### Алфавіт

Ужо ў другім тысячагоддзі да н. э. жыхары Усходняга Міжземнамор’я імкнуліся палепшыць і спрацціць вядомыя ім **іе**рогліфы і клінапіс. Гэту справу давяршылі фінікійцы*. У іх **з’**явіўся першы алфавіт з 22 літар. Алфавіт, ці азбука, — гэта збор пі**сь**мовых знакаў — літар. Кожная літара азначае на пі**сь**ме адзін гук, з якіх складаецца мова.

Гэты алфавіт меў вялікі недахоп. У ім былі то**ль**кі зычныя. Уявіце, што напісана *бк*. Якое ж гэта слова? «Бык», «бок»? Не**вя**дома! Грэкі, запазычыўшы фінікійскі алфавіт, дабавілі галосныя. Большасць алфавітаў свету, у тым ліку і беларускі, маюць фінікійскае паходжа**нн**е (*Паводле кнігі «Гісторыя Старажытнага свету»*).

Які алфавіт лічыцца першым? Хто і чаму дапрацаваў яго?

Якое паходжанне мае беларускі алфавіт?

Раскажыце пра асаблівасці беларускага алфавіта (у параўнанні з рускай мовай).

**27.** Размяркуйце словы па групах у адпаведнасці з графамі табліцы. Запішыце пад адпаведнымі лічбамі ў сшытку.

У з о р. *1. Весела, ...*
*2. Траўка, ...*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Весела, вяселле*, траўка, вугал, адрас, легенда, шаптаць, гэты, лідар, пясняр, каля ўвахода, пералаз, бярозка, цэгла, паўза, восеньскі, дарожка, блізка, у школе, памяць.

| Правапіс *е, ё, я* | Правапіс *у, ў* | Правапіс прыстаўных зычных | Правапіс *о, э, а* | Аглушэнне зычных у канцы ці сярэдзіне слова |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |

**28.** Спішыце прыказкі і прымаўкі, устаўляючы прапушчаны мяккі знак ці апостраф. Растлумачце іх правапіс.

1. Напалоханая варона і вераб..я баіцца. 2. Дзе гул..тай ходзіць, там зямля не родзіц.. . 3. Родная зямел..ка — як змораванаму пасцел..ка. 4. Жураўлі ляцяц.. нізка — зіма ўжо блізка.

Падкрэсліце словы, у якіх адбываецца аглушэнне зычных гукаў.

У якой прыказцы гаворыцца пра народную прымету? Як вы разумееце сэнс іншых выразаў?

Складзіце на аснове адной прыказкі (на выбар) невялікае выказванне.

**29.** Прачытайце тэкст. Растлумачце правапіс прапушчаных літар і раскрыйце дужкі.

Верабей — птушка зусім не шкодная, а карысная. Св..іх птушанят вераб*(?)*і выкормліваюць нас..комымі.[сн] *(?)*учоныя па*(д/т)*ліч..лі, што адна пара вераб*(?)*ёў знішчае на працягу дня каля пяцісот розных шкодных нас..комых. Калі ж вераб*(?)*і *(д/дз)*яўбуць часам ягады ці крадуць зерне, то лічыце гэта *(у/ў)*знагародай або нават заработнай платай за пільную ахову ўрад..аю ад шкоднікаў *(Паводле В. Вольскага)*.

Запішыце тэкст пад дыктоўку.

**30.** Запішыце загадкі, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Якія з’явы прыроды зашыфраваны ў іх?



1. Бе*(г/х)*ла ліска каля лесу blі*(з/с)*ка, ні сце*(ж/ш)*кі, ні даро*(ж/ш)*кі, тол..кі з..латыя ро*(ж/ш)*кі.

2. Б*(е/я)(з/с)* рук, б*(е/я)(з/с)* но*(г/х)*, а вароты адчыняе.



3. М..не ўсе просяць, *(у/ў)*се чакаюць, а як прыйду, хавацца пач..наюць.



## § 6. Слова, яго лексічнае значэнне

**31.** Прачытайце табліцу. Раскажыце на яе аснове пра групы слоў паводле значэння. Прывядзіце ўласныя прыклады.

| | |
|---|---|
| **Адназначныя словы** | словы, якія маюць адно лексічнае значэнне: *сініца, жыта, весяліца* |
| **Мнагазначныя словы** | словы, якія маюць некалькі лексічных значэнняў: ***медныя*** *манеты* — ***медныя*** *валасы* |
| **Прамое значэнне слова** | асноўнае лексічнае значэнне слова: ***рака*** — *прыродны вадаём, які пастаянна цячэ па пракладзеным вадой рэчышчы ад вытоку ўніз да вусця (пайсці на раку)* |
| **Пераноснае значэнне слова** | лексічнае значэнне слова, якое ўзнікла на аснове падабенства: ***рака*** — *няспынны паток чаго-небудзь, вялікая колькасць (людская рака)* |
| **Сінонімы** | словы, якія называюць адзін і той жа прадмет, з'яву, дзеянне ці прымету, адносяцца да адной часціны мовы, але па-рознаму вымаўляюцца і пішуцца: *гаворка, гутарка, размова* |
| **Антонімы** | словы адной і той жа часціны мовы з супрацьлеглым значэннем: *высокі — нізкі, праўда — хлусня* |
| **Амонімы** | словы адной і той жа часціны мовы, аднолькавыя па гучанні і напісанні, але розныя па значэнні: *аўсянка (каша) — аўсянка (птушка)* |
| **Фразеалагізмы** | непадзельныя, устойлівыя спалучэнні слоў з адзіным, цэласным значэннем: *нос павесіць — засумаваць* |

**32.** Прачытайце тэкст. Раскрыйце сэнс сказа «Вялікі табе дзякуй за тваё добрае сэрца!».

### Лупа

Часта, калі Юлька[ф] з маці прыязджалі да дзядулі, дык заставалі таго за разгадваннем розных шарад, крыжаванак. Дзед падносіў да самых акуляраў газету і моцна прыжмурваў вочы.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі